Выделяется несколько типов данной оппозиции: мифологический, тоталитарно-религиозный, философский. С точки зрения мифологического типа оппозиции, элементы «чужого», как правило, носят демонический характер. В романе носителями демонического начала выступает компания Бубенцова, первое появление которой предстает для тихого Заволжска как пришествие Апокалипсиса.

Обратившись к мифологическим мотивам, можно выяснить, что образ Бубенцова воплощает в себе черты Сатаны. Автор наделяет Бубенцова различными эпитетами, носящими исключительно пейоративную коннотацию: «зловредный инспектор», «синодальный паук» (использование архетипических анималистических образов – аллюзия на Змия), «бес», «злоделатель», «адское исчадие». Нередко Акунин прямо называет его Сатаной.

Бубенцов, как и Сатана, имеет приспешников. В христианской мифологии одним из значительнейших посланцев Дьявола является Антихрист – «противник Иисуса Христа, который явится в конце времён и возглавит борьбу против Христа, но будет им побеждён» [1, с. 85]. Он не Сатана, а человек, действующий по его наущению. Антихрист носит маску Христа, стремится занять место Христа, быть за него принятым.

Образ Антихриста воплощает Тихон Спасенный. На протяжении всего романа он носит маску благодетели и истовой набожности, своеобразную «маску Христа», при этом совершая чудовищные убийства.

Таким образом, с точки зрения мифологического типа оппозиции «свой – чужой» Бубенцов и его прислужники воплощают идею «чужого». Об этом свидетельствуют и мифологические прототипы персонажей, обладающие сатанинской природой, и различные демонические мотивы, проявляющиеся на различных уровнях текста.

**Литература**

1 Мифы народов мира. Энциклопедия: в 2 т. / Гл. ред. С. А. Токарев. – М.: Сов. энциклопедия, 1991. – Т. 1.: А – К. – 671 с.

***А. А. Целепнева***
*Навук. кір.* ***В. С. Новак,***
*д-р філал. навук, прафесар*

## ВЯСЕЛЬНАЯ АБРАДНАСЦЬ ГОМЕЛЬШЧЫНЫ: СЕМАНТЫКА ВОБРАЗАЎ-СІМВАЛАЎ

Вясельныя абрады і песні Гомельшчыны вылучаюцца разнастайнасцю вобразаў, іх самабытным характарам і адметнай семантыкай. Засяродзім увагу на адным з абрадавых этапаў давясельнага перыяду – сватанні, для якога былі характэрны рытуальныя іншасказальныя дыялогі і нешматлікія песні-ілюстрацыі.

Як вынікае з фактычных матэрыялаў, запісаных у розных раёнах Гомельскай вобласці, звычайна абрад сватання пачынаўся з алегарычнага дыялогу: “*Чулі мы, што вы прадаеце цёлку. – У нас цёлкі няма, а ў нас ёсць дзеўка*” [1, с. 5]. “*Мы ж прыйшлі па дзела. Наш бык к вашай цёлке прывык*” [1, с. 22]. Выкарыстанне зааморфных вобразаў (“цёлачка”, “бык”) у прыведзеным прыкладзе дазваляе сімвалічна абазначыць вобразы маладых і падкрэсліць факт устойлівасці бытавання народных вераванняў, звязаных з купляй-продажам нявесты.

У якасці вобразаў-сімвалаў маладой выступаюць і птушкі: “*Мы чулі многа добрага пра вашу дачушку, а ў нас ёсць галубок да пары вашай галубцы. Дык ці не спараваць нашых галубкоў?*” [1, с. 28].

У давясельнай лірыцы вобразы-сімвалы не толькі ўвасабляюць маладую і маладога, але, напрыклад, і сватоў. У залежнасці ад таго, як ставяцца да сватоў, апошнія могуць паўставаць у вобразах розных жывёл і птушак (“сівыя сокалы”,

“арлы”): *“Сівыя сокалы – сваты твае, / Чорны шоўк – коскі твое, / А золото – слёзкі твое”* [1, с. 89]; *“Наляцелі арлы да калодзежа, / Чулі яны, што вада халадна. // Наехалі сваты да Алесі, / Чулі яны, што работніца ды красавіца”* [1, с. 81].

Такім чынам, можна канстатаваць, што ў вясельных песнях, якімі суправаджаюцца розныя абрадавыя этапы, шырока выкарыстоўваюцца зааморфныя вобразы-сімвалы, што дае падставы сцвярджаць аб міфалагічным характары мыслення нашых продкаў, паэтычнасці светапогляду беларусаў.

**Літаратура**

1 Вяселле на Гомельшчыне: фальклорна-этнаграфічны зборнік / уклад. В. С. Новак. – Мінск: ЛМФ “Нёман”, 2003. – 472 с.

***А. П. Шукаловіч***
*Навук. кір.* ***В. С. Новак,***
*д-р філал. навук, прафесар*

## ПРЫКМЕТЫ І ПАВЕР’І Ў ВЯСЕЛЬНАЙ АБРАДНАСЦІ ЛЕЛЬЧЫЦКАГА РАЁНА

У вясельнай абраднасці Лельчыцкага раёна, якая захоўвае агульнаэтнічную аснову, знайшлі яскравае адлюстраванне міфалагічныя ўяўленні, звязаныя з элементамі жыллёвай прасторы, прадметнай атрыбутыкай і інш.

У этнаграфічных апісаннях вясельнага абрадавага комплексу ў розных лакальных традыцыях важнае месца займаюць прыкметы і павер’і, якія датычаць міфалогіі жыллёвай прасторы. Адзначым, што важнае магічнае значэнне мае такі элемент хаты, як парог, які ў народных вераваннях асэнсоўваецца як месца знаходжання душ памерлых. У в. Сіманічы падчас абрадавага этапа сустрэчы маладых *“і молода с порога начынае сеяць жыто”* [1, с. 300], што, паводле народных уяўленняў, павінна было сімвалічна забяспечыць ураджайнасць нівы.

У мясцовых прыкметах і павер’ях з’яўляецца адметным асэнсаванне семантыкі дзяжы як важнага прадметнага атрыбута вяселля. Менавіта з ёю звязаны рытуалы ў традыцыйным вяселлі вв. Сіманічы, Маркоўскае. Згодна з народнымі вераваннямі, маладая павінна была сесці на дзяжу, калі захавала цнатлівасць. Лічылася вялікім грахом, калі дзяўчына сядала на дзяжу, не з’яўляючыся “чыстай”: *“Потом вуносіць свекруха дзежку і засцілае надзежніцаю”* [1, с. 300], *“Выходзіць матка, выносіць кажуха, выварочвае яго. Выносіць дзежку і ставіць на шляху маладой”* [1, с. 317].

Прыкметы і павер’і, якія вылучаюцца ў структуры вясельнай абраднасці Лельчыцкага раёна, ілюструюць семантыку такога прадметнага атрыбута, як кажух, які, лічылася, сімвалізаваў багацце і ўплываў на дзетанараджэнне: *“Калі ж прыеджджаюць сваты і малады до двара молодой, то свацце ідуць прыглашаць до хаты, а цешча надзевае кожуха навыворот”* (в. Сіманічы) [1, с. 297].

Такім чынам, вясельная абраднасць Лельчыцкага раёна вылучаецца багаццем міфалагічных уяўленняў, прадстаўленых у прыкметах і павер’ях, якія цесна звязаны з рознымі абрадавымі этапамі і рытуаламі.

**Літаратура**

1 Вяселле на Гомельшчыне: фальклорна-этнаграфічны зборнік / І. Ф. Штэйнер, В. С. Новак. – Мінск: ЛМФ “Нёман”, 2003. – 472 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ